**Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі**
**«Центр творчасці дзяцей і моладзі Магілёўскага раёна»**

Навагодняя сюжэтна - гульнявая праграма
для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

# *«Навагоднія прыгоды Зюзі»*


***Распрацоўшчыкі:***
**Буглакова Марыя Аляксандраўна**,
культарганізатар ДУДА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Магілёўскага раёна»;
**Сапожнікава Ірына Аляксандраўна**,
педагог - арганізатар ДУДА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Магілёўскага раёна»
г. Магілёў, вул. Завадская, 23а
80222 74-50-09


Магілёў, 2024

## Уступная запіска

Навагодняя гульнявая праграма мае на мэце стварэнне амасферы свята, якое будзе аб’ядноўваць дзяцей. Праграма ахоплівае розныя аспекты – ад інтэлектуальных гульняў да фізічных спаборніцтваў, што дазволіць кожнаму ўдзельніку выявіць свае таленты і здольнасці. Гульні праходзяць у незвычайнай форме, што робіць іх больш цікавымі і захапляльнымі. Таксама важна, каб кожны ўдзельнік адчуваў сябе часткай калектыву, таму важнай часткай праграмы з’яўляецца ўззаемадапамога і дружба паміж удзельнікамі. Сюжэтна – іграван праграма разлічана для дзяцей 6 – 12 гадоў. Яе можна праводзіць у памяшканні ( на сцэне), і на вуліцы. Колькасць удзельнікаў не агранічана. Час правядзення праграмы – 20 хвілін.

**Мэта:** стварэнне атмасферы свята, якая спрыяе адпачынку, забаўленню і развіццю творчасці ўдзельнікаў.

**Задачы:**
- развіваць актыўнасць удзельнікаў у калектыве;
- спрыяць збліженню членаў каманды;
- выхоўваць пачуццё супольнай справы і дапамогі.

**Рэквізіт:**
- сняжкі з сінтэпона белага колеру – 30 шт.;
- вялікія навагоднія мяхі – 2 шт.;
- стужка ў форме ледзяшоў – 1 шт.;
- булава для Зюзі – 1 шт.;
- навагоднія сняжынкі з выявай снегавікоў у форме медальёна на шыю – 10 шт. (5 шт. чырвонага колеру і 5 шт. зялёнага колеру);
- елкі – 2 шт.;
- сляды-скараходы – 2 шт.;
- маленькія сняжынкі для удзельнікаў у зале (15 шт. чырвонага колеру і 15 шт. зялёнага колеру);
- круглая калонка Алеся.

**Прызы:** навагоднія цацкі і чупа-чупсы ў падарункавых мяшочках.

**Абсталяванне:** флэш - карта с запісам фанаграм, 2 радыё-мікрафона.

**Дзеючыя асобы:**
Мароз Зюзя, Снягурка Алеся, Снежык.

## Ход гульнявой праграмы

*Гучыць фанаграма завеі і голас за кадрам.*
*Зюзя гуляе па лесе.*

Ці то быль, а ці то небыль
Зараз вам раскажам мы,
Што ў далёкай снежнай пушчы
Жыў беларускі дух зімы.
Ахутваў зямлю ён снегам,
Мароз кусачы заклікаў.
Азёры, рэкі замарожваў,
Адным словам – лютаваў.
Аднойчы гуляў басанож ён па лесе,
У моцных руках булаву сваю нёс.
Чароўны праменьчык, прабіўшыся скрозь елкі,
У далёкую будучыню яго перанёс.

*Зюзя з'яўляецца ў нашым часе, у 2024 годзе.*
*Бачыць перад сабой калонку "Алеся". Пачынае яе трэсці.*
*Раздаецца голас Алесі.*

**Снягурка Алеся:** Паважаны Зюзя, па-першае, перастань мяне трэсці. А па-другое, сардэчна запрашаем у надыходзячы 2025 год на навагодняе свята. Мяне клічуць Алеся.
**Мароз Зюзя:** Якая яшчэ Ліса? Выхадзі, рудая плутоўка. Інакш усё тут замарожу!
**Снягурка Алеся:** Хвіліначку ... зараз з’яўлюся. Запускаю трансфармацыю.

*Гучыць музыка. На сцэне з'яўляецца Алеся.*

**Снягурка Алеся:** Трансфармацыя завершана. І я не ліса, я Алеся – на сёння ваш асабісты памочнік, ваш прэс-сакратар. У сувязі з тым, што Дзеда Мароза і Снягурачку запрасілі да сябе сябры на святы, мне было дадзена заданне як мага лепш развесяліць дзяўчынак і хлапчукоў.
**Мароз Зюзя:** Ну, а я тут пры чым?
**Снягурка Алеся:** Бачыш, я зразумела, што ў мяне нічога не выйдзе. Якое ж навагодняе свята без галоўных герояў?!!! Таму я звярнулася да інфармацыйных крыніц і высветліла, што ты Зюзя - шаноўны дух зімы, з'яўляешся прапрадзедам Дзеда Мароза, і таму я перанесла цябе ў наш час, каб ты замяніў яго і дапамог мне, а я – адпаведна стану тваёй унучкай Снягуркай.

**Мароз Зюзя:** Бач, чаго ўдумала! Мала таго, што адарвала мяне ад маіх спраў, дык яшчэ і весялосць ёй падавай. Зараз нашлю на вас завіруху, замарожу ўсіх.
**Снягурка Алеся:** Эх, зусім зачарсцвеў ты, Зюзечка, ў сваім лесе. Сядзіш там адзін і холадам усіх пужаеш. А ў нас, павер, табе вельмі спадабаецца! Тут гульні, танцы, песні, смех, а самае галоўнае, тут шмат вясёлых рабят... Тут усё, што твая душа пажадае!
**Мароз Зюзя:** Ох, прыгожа спяваеш!!! Як я разумею, ты ад мяне ўсё роўна не адчэпішся?
**Снягурка Алеся:** Не-а…
**Мароз Зюзя** (*разважаючы, расчэсваючы пальцамі бараду)***:** Добра, твая ўзяла. Выручу я цябе, расказвай, што трэба рабіць.
**Снягурка Алеся** (*разглядае вопратку Зюзі)***:** Гэта ўсё па ходзе справы, спачатку цябе трэба пераапрануць.

*Гучыць музыка. Снежык вывозіць вешалку з адзеннем.*
*Зюзя імгненна пераапранаецца.*

**Разам:** Сустракайце!
**Снягурка Алеся:** Мароз Зюзя.
**Мароз Зюзя:** І снягурка Алеся.
**Снягурка Алеся:** Дарэчы, пара б з дзяўчынкамі і хлапчукамі павітацца.
**Мароз Зюзя:** Дакладна, добры дзень, хлапчукі!
**Снягурка Алеся:** Добры дзень, дзяўчынкі!
**Мароз Зюзя:** Вітаем усіх хто ў гэтай зале!
**Снягурка Алеся:** Сёння мы з вамі адправімся ў захапляючае навагодняе падарожжа на сустрэчу 2025 года. Вы гатовыя з намі падарожнічаць? *(Зала адказвае.)* Каб наша падарожжа было вясёлым і незабыўным, нам усім неабходны добры настрой. А для гэтага ўсе весела і дружна запускаем рухавік навагодняга настрою і танчым флэшмоб!
Усе рухі паўтараем за намі.

**Навагодні танцавальны флэшмоб** *(суправаджаецца тэкстам і песняй)*

*Шлёп-шлёп, топ-топ,*
*Шлёп-шлёп, топ-топ*
*Шлёп-шлёп… пачынаем!!!*
*Танчыць усіх Зюзя запрашае.*
*(Паказваюць рухі, усе паўтараюць.)*
*Рухавік настрою запускай,*
*Так рабі, давай, давай, давай.*
*Так рабі, давай, давай, давай.*
*Рухавік настрою запускай. (2 разы)*

**Снягурка Алеся:** А зараз яшчэ хутчэй і весялей!

**Снягурка Алеся:** Малайцы! Бачу навагодні настрой у вас вельмі добры. Ці я памыляюся? Я чула, дзеткі, што вы вельмі любіце розныя гульні, а яшчэ больш любіце атрымліваць падарункі за гэта? Так ці не? *(Адказы дзяцей.)*
**Мароз Зюзя:** Бачу, вашы вочкі засвяціліся, на тварах з'явіліся ўсмешкі, значыць вы гатовы адправіцца насустрач прыгодам разам са мной і Снягуркай Алесяй. *(Адказы дзяцей.)*
А ці чулі вы калі-небудзь пра мяне, пра Зюзю? Калі чулі – малайцы. Але гэтага мала. Трэба не толькі чуць, але яшчэ і ведаць шмат цікавага пра мяне. І вось зараз мы даведаемся, хто з вас лепшы знаток. Паспрабуйце адказаць на мае пытанні. А ты, **Снежык**, не зявай, а самых актыўных выбірай.

**Віктарына**

*(За правільныя адказы **Снежык** дае сняжынкі – жэтоны зялёнага і чырвонага колераў з выявай Снегавікоў.)*

**Пытанні віктарыны:**

1. *Як завецца беларускі Дзед Мароз? (Зюзя)*
2. *Што носіць Зюзя ў руках? (Булаву)*
3. *Які год надыходзіць? (2025)*
4. *Чаму Зюзя часам бывае злосны? (Калі людзі паводзілі сябе дзёрзка, нядбайна)*
5. *Як можна задобрыць Зюзю? (Не паводзіць сябе дрэнна)*
6. *Як Зюзя мог пакараць нядобрасумленных людзей? (Замарозіць)*
7. *Які любімы пачастунак гатавалі для Зюзі ў вёсцы? (Зюзю частавалі куццёй)*

**Мароз Зюзя:** Ну, што ж, малайцы, добра вы ведаеце пра мяне. А зараз выйдзіце, калі ласка, да нас тыя, хто атрымаў сняжынкі – жэтоны зялёнага і чырвонага колераў ад майго памочніка Снежыка.

*Гучыць музыка. Удзельнікі выходзяць на сцэну.*

**Снягурка Алеся:** Хто атрымаў сняжынкі зялёнага колеру, будзе камандай "Ільдзінкі", гэта каманда Мароза Зюзі. А тыя, хто атрымаў сняжынкі чырвонага колеру, будзе камандай "Сняжынкі", гэта мая каманда. *(Звяртаючыся ў залу.)* Ну, што ж, паважаныя гледачы, вітаем нашы каманды.

Так, нешта наша зала не вельмі дружная, дрэнна вітае каманды. Каб у нас гэта справа пайшла лепш, я прапаную і вам раздзяліцца на дзве каманды. Тыя, хто атрымаў **сняжынкі зялёнага колеру,** будуць падтрымліваць каманду **"Ільдзінкі**". А тыя, хто атрымаў **сняжынкі чырвонага колеру** – каманду **"Сняжынкі".** Згодныя?

Ну, што ж, павітаем каманду **"Ільдзінкі**! А зараз – каманду **"Сняжынкі"**. Малайцы! Вось яны, вось яны нашы памочнікі. Каманда **"Ільдзінкі**" будзе камандай Зюзі, падыдзіце да яго і станьце адзін за адным у

калону. Мая каманда **“Сняжынкі”,** падыдзіце да мяне і таксама станьце адзін за адным у калону.

Зараз мы з вамі адправімся ў захапляючае падарожжа насустрач Новаму году. Але наперадзе ў нас заснежаны зімовы лес, праз які нам трэба прайсці. А дапамогуць нам у гэтым чарадзейныя снегатопы.

Вам неабходна іх надзець, дабегчы да елкі, аббегчы яе, вярнуцца да сваёй каманды, перадаць снегатопы наступнаму ўдзельніку і стаць у канец каманды. Хто хутчэй зладзіцца з заданнем – той і будзе пераможцам ў гэтым конкурсе. Заданне зразумелі?

Зараз па маёй камандзе і камандзе залы вы пачынаеце 3,2,1! Пачалі!!!

*Гучыць музыка.*

**Гульня “Чароўныя снегатопы”**

**Снягурка Алеся** *(звяртаючыся да залы)***:** Зала не забывае падтрымліваць нашы каманды. А дзе нашы **сняжынкі зялёнага і чырвонага колеру**? Паднялі іх угару і памахалі… Падтрымаем нашы каманды, гучней, гучней. А дзе нашы балельшчыкі каманды **“Ільдзінкі**”*?* Апладысменты!

А дзе балельшчыкі каманды **“Сняжынкі”**?! Тупаем, пляскаем. Гучней, яшчэ гучней. А зараз падтрымаем абедзьве каманды. Апладысменты!!!

**Мароз Зюзя:** Ну, што ж, нашы каманды справіліся з заданнем. Паглядзіце, якія яны малайцы. Але каманда _________ справілася хутчэй. І яна стала пераможцам у гэтым конкурсе. Апладысменты камандзе__________.

І каманда ____________ атрымлівае сваю першую “**Навагоднюю цацку”.** Калі ласка.

*Гучыць музыка. Пераможцам на елку прымацоўваецца “навагодняя цацка”.*

**Снягурка Алеся** *(звяртаючыся да ўдзельнікаў)***:** Ну што ж, з гэтым заданнем вы справіліся. А мы пойдзем з вамі далей насустрач прыгодам. Бо Новы год – гэта час цудаў і жаданняў. І для таго каб вашы жаданні здзейсніліся, вам неабходна узяць **навагодні мяшок цудаў,** заскочыць у яго, **загадаць жаданне**, даскакаць у мяшку да вострых і калючых ледзяшоў, асцярожна прайсці пад імі, не закрануўшы іх, вярнуцца назад да сваёй каманды, перадаць мяшок наступнаму ўдзельніку і стаць у канец каманды. Тая каманда, якая першая справіцца з гэтым заданнем, і не апынецца замарожанай, будзе пераможцам і атрымае сваю “**навагоднюю цацку”.** Вам заданне зразумела? *(Звяртаючыся ў залу.)* Зала, падтрымаем нашы каманды! Гатовы? Усе разам! 3,2,1 – пачалі.

*Гучыць музыка.*

**Гульня “Мяшкі навагодніх жаданняў”**

**Снягурка Алеся** *(звяртаючыся да залы)***:** Дзяўчынкі і хлапчукі, падтрымаем нашы каманды, гучней, гучней. Балельшчыкі каманды **"Ільдзінкі**". Апладысменты! А дзе балельшчыкі каманды **"Сняжынкі"**?! Тупаем, пляскаем. Гучней, яшчэ гучней.

**Мароз Зюзя** *(да ўдзельнікаў)***:** Малайцы, і з гэтым заданнем вы справіліся. У вас вельмі добра атрымалася! Я думаю мяне падтрымае і зала, калі мы перамогу аддадзім абедзвюм камандам. Згодны?

Каманда "……………" і каманда "…………" атрымліваюць свае навагоднія цацкі.

*Гучыць музыка.*
*Пераможцам на елку прымацоўваецца "навагодняя цацка".*

**Снягурка Алеся:** Зараз мы ідзём далей насустрач прыгодам. Наш Мароз Зюзя – грозны бог зімы. У яго ўладзе завеі і завірухі.

І вось зараз Зюзя выклікаў завіруху і снежную буру і намёў шмат снегу. *(Гучыць фанаграма завірухі.)* А які жа Новы год без снега і сняжкоў?

А зараз мы прапануем кожнай камандзе навагоднія сняжкі. Выкарыстоўвайце снежныя снарады для нападу.

Той, хто больш перакіне сняжкоў на бок свайго суперніка пакуль гучыць музыка і б'юць навагоднія куранты, і будзе пераможцам у гэтым конкурсе. Заданне зразумелі? Усе разам! 3,2,1 – пачалі.

*Гучаць навагоднія куранты.*

**Гульня "Снежная бітва"**

**Снягурка Алеся:** Зала, падтрымаем нашы каманды!
Балельшчыкі каманды **"Ільдзінкі"**, падтрымаем сваю каманду. Балельшчыкі каманды **"Сняжынкі",** таксама падтрымліваем сваю каманду. Гучней, гучней. Паглядзіце, якія яны малайцы!

**Мароз Зюзя** *(да ўдзельнікаў)***:** Малайцы, вы справіліся і з гэтым заданнем. У вас вельмі добра атрымалася! А зараз мы палічым, хто больш перакінуў сняжкоў у бок суперніка. Лічым разам з залай.

*Гучыць музыка. Усе разам лічаць сняжкі і закідваюць у навагоднія мяхі.*

**Мароз Зюзя:** Каманда _________ лепш справілася з гэтым заданнем і атрымлівае "навагоднюю цацку".

*Гучыць музыка.*
*Пераможцам на елку прымацоўваецца "навагодняя цацка".*

**Мароз Зюзя:** Ну што ж, куранты прабілі. Настаў час сустракаць Новы год вясёлай песняй. Спяваем разам з намі!

**Выконваецца песня “Новы год”**

*Год за годам каляндар, дата - трыццаць першае.*
*Вынік мы падводзім, зрываем ліст апошні*
*Людзі цудаў усе чакаюць і жадаюць усім дабра!*
*Моцнага здароўя і здзяйсненняў!*
*З Новым годам! З Новым годам!*
*З нашай добрай Беларусі мы усе родам.*
*Па дарозе новай пойдзем,*
*З добрым мы настроем у Новы год увойдзем.*

**Мароз Зюзя** *(дзякуе за удзел у гульнях)*: Ну а зараз надышла пара ўручыць падарункі нашым удзельнікам, бо яны вельмі добра гулялі і выдатна справіліся з усімі заданнямі. Ну што ж, паглядзім, якая каманда ў нас атрымала больш навагодніх цацак. Каманда “**Ільдзінкі**” атрымала _____ навагодніх цацак. Апладысменты! А ў каманды **“Сняжынкі”**_____ навагодніх цацак. Пераможцам у нас стала каманда ________. Апладысменты гэтай камандзе!

Ну, і, канешне, мы падтрымаем каманду __________. Бо яны таксама вельмі стараліся. Каманды атрымліваюць ад нас вось такія падарункі.

*Гучыць музыка. Узнагароджванне каманд.*

**Мароз Зюзя:** Дзякуй вам, дарагія дзеткі, за ваш актыўны ўдзел. Нам вельмі спадабалася ў вас у гасцях. Добрага вам настрою! І няхай Новы год прынясе ўсім шчасце і здароўе.
**Снягурка Алеся:** Дзякуй вам! Займіце свае месцы ў зале. З Новым годам! Да пабачэння! Да новых сустрэч!